# Малітва ў гуку



Свята Калакольнага звону праходзіць на Хоцімшчыне ўжо другі раз. Для хацімчан - гэта асаблівы значымы дзень. Адарвацца ад паўсядзённай мітусні, прыйсці ў храм, паставіць свечачку, памаліцца. Як часта мы гэта робім? Калі прызнацца адкрыта, толькі на Вялікія святы, ды і то не заўсёды. У гэты ж дзень, нягледзячы на пранізлівае надвор'е, жыхары прыходзілі і прыходзілі ў храм - прапусціць такую падзею не жадалася.

Вядома, што звон - гэта малітва ў гуку, і гэты гук немагчыма апісаць адной, ці двума нотамі. Калакольны звон у сваёй сіле і прыгажосці незвычайна гаючы для кожнага чалавека. Ён лечыць душу і цела, узвышае духоўна, энергетычна, умацоўвае фізічнае здароўе. Увогуле, Свята-Троіцкі сабор - жамчужына зямлі хоцімскай, і ў гэтым нямалая заслуга архімандрыта Кірыла, кіраўніцтва раёна і простых вернікаў.

- Наш сабор унікальны. Ён будаваўся 12 гадоў, з часоў стварэння многае змянілася ў яго абліччы. У хуткім часе Свята-Троіцкі сабор паўстане ў новай выяве. Яго ўпрыгожаць вызалачаныя купалы. Дзякуй усім, хто дапамагаў у зборы грашовых сродкаў на будаўніцтва, - канстатаваў настаяцель сабора.

Пачалося свята правядзеннем літургіі з удзелам святароў з Расійскай Федэрацыі, настаяцелем была выказана падзяка за правядзенне службы. Святочнае набажэнства праходзіла па чыне, пасля чаго быў здзейснены Крыжавы ход да паклоннага крыжа, дзе таксама было праведзена набажэнства.

Пасля вяртання ў царкву прысутныя змаглі атрымаць асалоду ад выступлення дзіцячага хора сабора і хора Магілёўскага філіяла Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

-Царква - адзін з важнейшых сацыяльных інстытутаў культурнай спадчыны, які аказвае ўплыў на фарміраванне духоўна-маральнага развіцця, прынцыпаў дабра і справядлівасці. Перад дзяржавай і царквой нават і задачы стаяць агульныя- стабільнасць і дабрабыт народа. Значны ўклад у будаўніцтва храма зроблены як з боку жыхароў Хоцімшчыны, так і з боку знакамітых людзей. Сярод якіх нашы зямлякі Надзея Ермакова, Уладзімір Канавалаў, Мікалай Чэпікаў, Іван Кажамяка і іншыя,- адзначыў глава рэгіёна Фёдар Вішнеўскі.

Калакольны звон насычае прастору пазітыўнай энергіяй, напаўняе паветра энергіяй дабра і любві. Паказальны выступ званароў Мінскай школы можна было пачуць поруч увахода ў храм. Гук кожнага звана ўнікальны, стварае адпаведны эмацыйны настрой. Можна было пачуць розныя групы званоў ад



святочных, шлюбных да пахавальных.

Станоўчыя цёплыя водгукі былі ад служэбнікаў царквы і простых слухачоў. Ёсць спадзяванне, што наш невялікі гарадок надоўга запомніцца ўсім гасцям, а мы, жыхары Хоцімска, будзем з нецярпеннем чакаць наступнага свята Калакольнага звону.

І калі давядзецца мне дзе-небудзь пачуць калакольны звон, я абавязкова спынюся і паслухаю, бо калі чуеш гэту "нябесную музыку", часцінка Божага кахання дакранаецца да самага сэрца, і тады яно поўніцца светам і спакоем.

**Вольга ЗАЙЦАВА.**
**Фота Аляксандра АЛЯКСАНДРЫНА**

**Зайцава, В. Малітва ў гуку** : на Хоцімшчыне праходзіць свята Калакольнага звону / Вольга Зайцава // Шлях Кастрычніка. — 2012. — 13 кастрычніка. — С. 2.